Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:44:49

Зоя Заіка
Брэст

Адтапанімныя дэрываты в гаворках Заходняга Палесся

Toponymic derivatives in the dialects of West Polesie

Адтапанімныя дэрываты (ад'ектонімы і катайконімы) – вялікі старажытны пласт лексікі беларускай мовы, словаўтваральная норма якога фарміруецца спантанна. Разам з тым на сучасным этапе развіцця культуры адбываецца мэтанакіраванае, асэнсаванае ўтварэнне ад'ектонімаў і катайконімаў і іх вытворных.

Адтапанімныя вытворныя выйшлі за межы дыялектнага і бытавога маўлення, яны шырока выкарыстоўваюцца ў афіцыйна-дзелавым, навуковым стылях, у розных жанрах мастацкай літаратуры. Беларускія мовазнаўцы актыўна пачалі займацца складаннем слоўніка ад'ектонімаў і катайконімаў толькі ў другой палове XX ст., аднак у сілу пэўных абставін гэтыя лексемы прааналізаваны толькі на абмежаваных тэрыторыях моўных арэалаў (В. В. Шур, З. М. Заіка, Н. М. Генкін і інш.).

Разглядзеўшы 704 артыкулы са *Слоўніка тапонімаў і адтапанімных дэрыватаў у арэале заходнепалескіх гаворак*[1], мы прыйшлі да высноў, што толькі аналіз поўных адтапанімных дэрывацыйных ланцужкоў з усімі вядомымі варыянтамі можа паказаць сапраўдную карціну спецыфікі марфемнай здатнасці ў працэсе ўтварэння катайконімаў на азначанай тэрыторыі.

Адтапанімным дэрывацыйным ланцужком мы лічым групу ўзаемазалежных вытворных лексем у структурна-сэнсавых адносінах, у якім дамінантным кампанентам з'яўляецца незалежная адзінка – тапонім, таму што семантыка ўсіх вытворных тым ці іншым чынам з ім звязана. Намі вычленены пяцікампанентныя ланцужкі: тапонім, ад'ектонім, катайконім множнага ліку, катайконім мужчынскага роду, катайконім жаночага роду, напрыклад: ***Далбнёва*** *– дулбнівскі; мн. Дулбнівці, дулбнювскіе, з Дулбнюва; адз.м. дулбнювэць, дулбнівскі, з Дулбніва; ж. дулбнівка,*

[1] З. М. Заіка, *Слоўнік тапонімаў і адтапанімных дэрыватаў у арэале заходнепалескіх гаворак*, Брэст 2001.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:44:49

з Дулбніва, дулбніска. ***Кострава*** *– кастровскі; мн. Кастровці, кастровчаны, кастровляне; адз.м. кастровэц, з Кострова, кастровлянін, кастровчанін, кастровскі; ж. кастровка, кастровлянка, кастровчанка, з Кострова, кастровска.*[2]

Аналіз словаўтваральных тыпаў ад'ектонімаў[3] паказаў, што пры іх утварэнні істотнае значэнне мае род тапонімаў і характар іх асноў. У межах словаўтваральнага разраду ад'ектонімаў выдзяляецца пяць асноўных словаўтваральных тыпаў на падставе фармальнага паказчыка граматычнага роду матывуючага тапоніма: а) ад'ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме мужчынскага роду; б) ад'ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме жаночага роду; в) ад'ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме ніякага роду; г) ад'ектонімы, матываваныя тапонімамі ў форме множнага ліку; д) ад'ектонімы, матываваныя састаўнымі тапонімамі.

Пры ўтварэнні ад'ектонімаў найбольшай прадуктыўнасцю валодае суфікс *-ск-*. У яго афармленні нарматыўнымі можна прызнаць ад'ектонімы, утвораныя: ад асноў аднаскладовых тапонімаў мужчынскага роду (*Бор – борскі, Гай – гайскі*); ад асноў тапонімаў мужчынскага роду на *-ін/-ын, -оў/-аў, -ец/-эц* (*Столін – столінскі, Пінск – пінскі*); ад асноў тапонімаў ніякага роду суфіксальна-прэфіксальнага ўтварэння (*Заазер'е – заазерскі*); ад асноў на *-ова/-ава, -ева/, -іна/-ына* (*Стахава – стахаўскі, Крушына – крушынскі*); ад асноў тапонімаў множнага ліку на *-ічы/-ычы, -іцы/-ыцы, -аны/-яны, -оны* (*Гершоны – гершонскі, Галоўчыцы – галоўчыцкі*).

Складаныя суфіксы *-оўск/-аўск, -анск/-янск, -інск* утвараюць адтапанімныя прыметнікі ад розных фонамарфемных структур асновы тапоніма. Далучэнне суфікса да асновы тапоніма ў большасці выпадкаў не суправаджаецца фонамарфемнымі працэсамі на стыку морфаў: *Аджын – аджынскі, Фанопаль – фанопальскі.* Аднак у прыметніках, утвораных ад тапонімаў на *-ка,* зычны асновы *к* у спалучэнні з суфіксам *-к* дае *-ц*: *Белінок – беліноцкі, Гусак – гусацкі.* Калі аснова тапоніма заканчваецца на *-ц,* суфіксальнае *с* асімілюецца з ім: *Алясец – алясецкі, вугалец – вугалецкі*. У ад'ектонімах ад тапонімаў на *-ск/-цк* адбываецца накладанне суфіксаў вытворнай і ўтваральнай асноў *(Бельск – бельскі, Вартыцк – вартыцкі).* У большасці выпадкаў у заходнепалескіх гаворках пры ўтварэнні адтапанімных ад'ектонімаў у апошнім знікае прыстаўны *в*: *Востраў – 'остраўскі, Вошчын – 'ошчынскі.*

Спецыфіка ўзнікнення і функцыянавання тапонімаў і вытворных ад іх ад'ектонімаў пераконвае ў тым, што на ўтварэнне ад'ектонімаў уплываюць, у першую чаргу, такія фактары, як традыцыйнасць і дыялектныя асаблівасці зоны іх бытавання.

У адтапанімны дэрывацыйны ланцужок могуць уваходзіць лексемы, утвораныя рознымі словаўтваральнымі спосабамі (семантычны, марфемны, марфалагіч-

[2] Тут і далей прыклады падаюцца спрошчанымі арфаграфічнымі сродкамі беларускай мовы.

[3] З. М. Заіка, *Словаўтварэнне адтапанімных прыметнікаў* (*на матэрыяле гаворак Брэсцкай вобласці*), „Беларуская лінвістыка", вып. 44, Мінск 1994, с. 27–34.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:44:49

на-сінтаксічны, словаскладанне). Самай прадуктыўнай разнавіднасцю марфемнага спосабу, пры дапамозе якога ўтвараюцца назвы жыхароў па месцы жыхарства, з'яўляецца суфіксальны, таму што менавіта суфіксальныя марфемы ў сінтагматычным радзе праяўляюць розную патэнцыяльную магчымасць да аб'яднання з іншымі марфемамі.

Асабліва складанай застаецца праблема ўтварэння катайконімаў у сувязі з тым, што на дэрывацыйныя працэсы намінацый у арэале Заходняга Палесся ўплываюць як законы сучаснай беларускай мовы, так і традыцыйная моўная практыка, мясцовыя дыялекты[4], гістарычныя і запазычаныя формы словаўтваральных марфем і мадэляў рускай, украінскай і польскай моў. Таму, калі мы гаворым пра валентнасць адтапанімных дэрыватаў, то маем на ўвазе патэнцыяльнасць адтапанімнага дэрывацыйнага працэсу, які мае (улічваючы вышэй пералічаныя абставіны) неабмежаваны характар і выражаецца ў практычнай магчымасці ўтвараць назвы жыхароў па месцы жыхарства ад кожнага тапоніма. Валентнасць вызначае семантычную напаўняльнасць вытворнай і ўтваральнай асноў у словаўтваральнай пары дэрывацыйнага адтапанімнага ланцужка.

Катайконім мужчынскага і жаночага роду цесна звязаны з тапонімам і катайконімам множнага ліку. Паўната ланцужка залежыць як ад пазамоўных і ўнутрымоўных прычын, так і ад марфемнай будовы кампанентаў дэрывацыйнага ланцужка. Для вызначэння валентнасці марфем вытворных мы вылучаем асновы розных мадэляў з адтапанімнага ланцужка. Субстантыўныя лексемы ланцужка заходнепалескага арэала гаворак маюць больш пашыраную структуру з марфемнымі сінтагмамі: *-ане – анін – анка* і *-цы – ец –ка.*

У выніку ўзаемадзеяння азначаных структур узнікаюць ланцужкі з інтэграванымі дэрывацыйнымі структурамі. Напрыклад: ***Вугалец –*** *вугальчане, угальчанцы, гольчанцы, гольчане; угольчанэц, гольчанін, гольчанэц, гольчак, угольчак, гольчанскі; угольчанка, гольчанка, гольчанска.*

Дэрывацыйныя рады адтапанімнай лексікі ў арэале заходнепалескіх гаворак прадстаўлены па-рознаму. Найбольш поўна рады адтапанімных дэрыватаў звязаны з самымі даўнімі пасяленнямі. З асновамі такіх тапонімаў звязаны фемінныя, маскулінныя і множналікавыя катайконімы: ***Агдамер*** *//* ***Огдэмэр***, *агдамерскі / огдэмэрскы; агдамерцы / огдэмэрцы;* (адз. м.) *агдамерац / огдэмэрэц;* (ж.) *агдамерка / огдэмэрка* (Др.). ***Альпень*** *//* ***Ольпень***, *альпенскі / ольпэнскі; альпенцы / ольпэнцы, (*адз.) *альпенец / ольпэнэц, альпенка / ольпэнка* (Ст.)[5]

Часта намінацыі з гэтых радоў маюць шэраг варыянтаў (фанетычныя, марфалагічныя, лексічныя). Гэтыя з'явы звычайна звязаны з міграцыяй насельніцтва, перайменаваннем былых назваў, білінгвістычным моўным асяроддзем, асаблівасцямі дыялектнай мовы і іншымі экстралінгвістычнымі і гістарычнымі фактарамі. Напрыклад: ***Абрамава // Абрамуво,*** *абрамаўскі / абрамувські; абрамаўцы / абра-*

[4] Ф. Д. Клімчук, *Гаворкі Заходняга Палесся: фанетычны нарыс*, Мінск 1983.

[5] З. М. Заіка, *Слоўнік тапонімаў і адтапанімных дэрыватаў…*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:44:49

мувці; (м.) *абрамавец / абрамувэць, абрамчук, з Абрамува;* (ж.) *абрамаўка / абрамувка, абрамчанка, абрамчучка* (Кам.). ***Багуславка // Богуславка Прыбрыдде****, багуслаўскі / богуславскый; багуслаўцы / богославці, прыбрідці,* (адз. м.) *багуславец / богославэць, з Прыбрыддя;* (ж.) *багуславка / богославка, прыбрідка* (Мал.).[6]

У больш позніх пасяленнях адтапанімныя дэрываты прадстаўлены не заўсёды поўна. Найчасцей адсутнічаюць фемінныя намінацыі або фемінныя і маскулінныя: ***Агова // Огово***, агоўскі / *оговскі; агоўцы / оговцы; (адз.) з Агова (м.) / з Огова (м.); з Агова (ж.)* / Оговска (ж.), *з Огова* (ж.). ***Адамк'ова // Адам'ова***, *адамк'оўскі / адамк'овскі, адамк'оўцы / одамівці; адамк'овец* (м.), *з Адамк'ова / одамівіца* (м.); *з Адамк'ова* (ж.) / *Одамівска* (ж.) (Др.).[7]

Адсутнасць фемінных катайконімаў можа быць звязана з мясцовай традыцыяй, калі маскулінныя і фемінныя намінацыі абслугоўваюцца адной лексемай. Найбольш цікавым у этнічным плане з'яўляецца словаўтваральны тып з фемінным суфіксам *-іца(-ыца, -аніца)*, пры дапамозе якога ўтвараюцца катайконімы мужчынскага роду тыпу (***рухчаніца*** ад Рухча, ***семігошчаніца*** ад Семігосцічы). У сучаснай беларускай літаратурнай мове гэты тып мае выключна фемінае значэнне. У вусна-бытавых зносінах ён паспяхова канкурыруе з суфіксам *-ец/-эц* і *-анін/-янін, -чанін*: ***рухчаніца – рухчанін, рухчанец; семігошчаніца – семігошчанец, плотнічаніца – плотнічанін***. Гэты словаўтваральны тып не фіксуюць ні дыялектныя слоўнікі, ні картатэкі. Па назіраннях даследчыкаў, мужчынскі тып на *-іца / -ыца* сустракаецца на землях ранняга славянскага пасялення, у прыватнасці, яго сляды выяўлены ў Закарпацці, Чарнігаўшчыне, Роўненшчыне, Беласточчыне, Мазыршчыне. У арэале Заходняга Палесся ён сканцэнтраваны пераважна ў межах Столінскага, Пінскага, Іванаўскага, Дрыгічынскага раёнаў.

Ад састаўных айконімаў асабовыя намінацыі мужчынскага роду з суфіксамі *-іца/-ыца, -ук/-юк, -чук*[8] зафіксаваны толькі ад субстантыўных кампанентаў айконімаў: ***Давыд-Гарадок*** – *городчук;* ***Малая Плотніца*** – *плотнічаніца.*

Разгледзім больш падрабязна словаўтваральныя субстантыўныя мадэлі катайконімаў множнага ліку, якія з'яўляюцца найбольш прадуктыўнымі для арэала гаворак Заходняга Палесся і прааналізуем спалучальнасць словаўтваральных марфем (валентнасць) з пэўным колам матывуючых асноў, вызначыўшы пры гэтым асаблівасці іх марфатактыкі.

Для абазначэння катайконімаў множнага ліку выкарыстоўваюцца суфіксы *-ц(ы), -ан(е), -оўц(ы), -анц(ы), -енц(ы), -ен(ы), -авян(е), -чук(і), -чак(і), -ух(і).* Самым прадуктыўным з'яўляецца суфікс -ц(ы), у афармленні якога нарматыўнымі з'яўляюцца катайконімы, утвораныя ад асноў айконімаў на *-ін/-ын, -оў/-аў, -еў, -ова/-ава, -ічы/-ычы*. Суфікс *-ц(ы)* свабодна далучаецца да поўных асноў ай-

[6] *Ibidem.*

[7] *Ibidem.*

[8] З. М. Заіка, *Аб утварэнні катайконімаў мужчынскага роду ад састаўных айконімаў*, [у:] *Українська філологія: школи, постаті, проблемы*, Львів 1999, с. 48–50.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:44:49

конімаў на *-ін/-ын, -оў/ -аў, -ова/ -ава, -аны/-яны*, пры гэтым на стыку морфаў не адбываецца ніякіх фонамарфемных з'яў: ***Столін*** *– столінцы,* ***Бораў*** *– бораўцы,* ***Бялёва*** *– бялёўцы,* ***Павіцце*** *– павіццы,* ***Альшаны*** *– альшанцы*. Валентнасць суфікса *-ц(ы)* патрабуе ўсячэння асновы айконіма на *-ічы/ -ычы* (***Манькавічы*** *– маньКаўцы*), *-ка* (***Вашчанка*** *– вашчанцы*). Без парушэння структуры матывуючых асноў катайконімы множнага ліку ўтвараюцца пры дапамозе складаных суфіксаў *-оўц(ы), -аўц(ы), -еўц(ы)*, у тым разе калі аснова мае фіналь *-ін/-ын* (***Вошчын*** *– вошчынаўцы*), з асновай айконіма на заднеязычны (***Бадзюкі*** *– бадзюкоўцы*), або калі аснова ад'ектыўнага характару (***Высокае*** *– высокаўцы*).

Матывуючае слова, з асновай якога звязаны адтапанімныя дэрываты, у пераважнай большасці – тапонім. Для адтапанімнага словаўтварэння, у першую чаргу, сутнымі з'яўляюцца толькі прадуктыўныя суфіксы. Аднак і малапрадуктыўныя мадэлі, варыянтныя мадэлі не застаюцца па-за межамі нашай увагі.

Словаўтваральныя складаныя суфіксы *-анц(ы)/-янц(ы), -інц(ы), -енц(ы)* далучаюцца да поўнай асновы айконімаў, калі яны маюць фіналь на заднеязычны, на *-іца/-ыца, -ішча/-ышча, -ічы/-ычы,* у некаторых выпадках адбываецца чаргаванне (***Бродніца*** *–* ***броднічанцы,*** ***Белінок*** *–* ***белічанцы,*** ***Буг*** *–* ***бужанцы***).

Суфікс *-ан(е)/-ян(е)* і яго ўскладненыя варыянты *-чан(е), -нічан(е), -аўчан(е)* лёгка прыстасоўваецца да поўных асноў айконімаў на *-ец/-эц* (***Дварэц*** *–* ***дварчане,*** ***Галец*** *–* ***гальчане,*** ***Сялец*** *–* ***сяльчане,*** ***Дубаўцы*** *–* ***дубаўчане,*** ***Гнілец*** *–* ***гнільчане,*** ***Дварцы*** *–* ***дварчане***), на *-іца/-ыца* (***Плотніца*** *–* ***плотнічане,*** ***Сітніца*** *–* ***сітнічане,*** ***Бродніца*** *–* ***броднічане*** і да асноў айконімаў на *г, к, х,* аднак пры гэтым абавязкова адбываецца чаргаванне зычных на стыку морфаў (***Струга*** *–* ***стружане,*** ***Канюхі*** *–* ***канюшане,*** ***Суткі*** *– сутнічане*).

Дэрывацыйны тып катайконімаў множнага ліку з суфіксам *-ук(і), -чук(і), -чак(і)* спарадычна прадстаўлены ў гаворках Заходняга Палесся Беларусі. У якасці ўтваральнай асновы выступаюць розныя тыпы айконімаў (***Дварэц*** *–* ***дварчакі,*** ***Пінск*** *–* ***пінчукі,*** ***Давыд-гарадок*** *–* ***гарадчукі***). Асаблівасці ўтварэння такіх найменняў заключаюцца ў тым, што іх семантыка мае дзве аманімічныя формы, з якіх адна мае негатыўную адзнаку, а другая гэтай адзнакі не мае. Сёння суфікс *-ук(і)/ -юк(і)* набывае значна выражаную нейтральную функцыю, катайконімы ў яго афармленні ўсё часцей трапляюць у перыядычны друк.

Сучасныя адтапанімныя намінацыі не губляюць сувязяў з дыялектна-бытавой асновай і мясцовымі традыцыямі, і таму заканамерна варыятыўнасць адтапанімных утварэнняў.

Множналікавыя асабовыя намінацыі, утвораныя ад асноў айконімаў на *-ск/-цк, -ова/-ава, -ка, -іца/-ыца, -ічы/-ычы,* на *г, к, х, ьjэ, -ін/-ын* даволі часта маюць варыянтныя сінанімічныя формы (*Пінск – пінчане, пінчанцы, пінчукі;* ***Бухлічы*** *– бухлічане, бухлічанцы, бухлічукі;* ***Струга*** *– стружане, стружанцы*) і г.д. Карэктнасць падачы адтапанімнага матэрыялу заключаецца ў захаванні поўнай утваральнай асновы (інакш будзе ад ***Альшаны*** *–* *альшанцы* і ад ***Альшанка*** *–* *альшанцы*). Аднак нават самы прадуктыўны суфікс *-ц(ы)* не заўсёды здатны

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:44:49

прыстасавацца да любой фіналі айконіма, і ў гэтым выпадку на марфемным шве ўзнікаюць інтэрфіксы *-оў/-аў, -еў, -ан/-ян, -ін, -ен,* якія дапамагаюць спалучыць суфікс *-ц(ы)* з асновай айконімаў. У адтапанімным словаўтварэнні гэты інтэрфікс разам з прадуктыўным суфіксам прынята называць складаным суфіксам. Як мы заўважылі, і складаныя суфіксы не ў кожным выпадку могуць далучацца да поўнай асновы. Усякаюцца асновы айконімаў на *-ічы/-ычы, -кі, -ец/-эц* (***Блювінічы*** *– блювінінцы,* ***Ліпнікі*** *– ліпнянцы,* ***Гнілец*** *– гнілічане*).

У адтапанімным словаўтваральным ланцужку множналікавыя катайконімы – рэгулярная прадуктыўная лексема. Рэгулярнымі прадуктыўнымі намінацыямі з'яўляюцца і катайконімы мужчынскага роду. У гаворках Заходняга Палесся Беларусі яны ўтвараюцца пры дапамозе самых розных суфіксаў: *-ец, -авец, -анец, -інец, -іца, -аніца, -анін, -чанін, -чанец, -ук/-чук* (***Брадзяцін*** *– брадзянінэц,* ***Быстрыца*** *– быстровэц,* ***Рухча*** *– рухчаніца,* ***Лядэц*** *– Лядчук*).

Словаўтваральны тып з суфіксам *-ец* самы прадуктыўны пры ўтварэнні катайконімаў мужчынскага роду, аднак часцей за ўсё ён далучаецца да ўсечанай асновы айконімаў (***Ластаўкі*** *– ластавэц,* ***Манькавічы*** *– манькавэц,* ***Дзямідаўшчына*** *– дэмідовэц*). Звычайна суфікс *-ец* і яго вытворныя далучаюцца да поўнай асновы айконіма тады, калі фармант утваральнай асновы заканчваецца на *-оў/-аў, -ін/-ын* (***Столін*** *– столінец,* ***Кобраў*** *– кобровэц*). У заходнепалескіх гаворках суфікс *-ец* у большасці выпадкаў націскны.

Беларускія мовазнаўцы А. А. Паўленка, В. І. Піскун, Л. М. Шакун, П. П. Шуба, Т. М. Шчур і інш., якія ў той ці іншай ступені даследавалі пытанні адтапанімнага словаўтварэння, прытрымліваюцца думкі, што словаўтваральныя працэсы катайконімаў суадносяцца з агульнымі тэндэнцыямі развіцця словаўтваральнай сістэмы беларускай мовы і, ў сваю чаргу, прызнаюць жаночыя асабовыя намінацыі другаснымі ў адносінах да аднакаранёвых мужчынскіх.

Як карэляцыйныя пары разглядаюць іх У. В. Вінаградаў, А. А. Земская і іншыя спецыялісты ў галіне словаўтварэння. Пры аналізе карэляцыйнай суаднесенасці мужчынскіх і жаночых асабовых намінацый выявілася двухбаковая структурна-семантычная сувязь: суаднесенасць жаночых асабовых намінацый з мужчынскімі, а праз іх ці непасрэдна – з айконімамі.

Аднак існуе шэраг выпадкаў, калі нельга не пагадзіцца з тым, што для жаночых асабовых намінацый матывуючай базай з'яўляецца айконім. Напрыклад: *дворч'ак – дворч'анка –* ***Дварц'ы****, драг'ічынец – драг'ічынка –* ***Драг'ічын****.* Да таго ж у заходнепалескіх гаворках ёсць выпадкі, калі мужчынскія асабовыя намінацыі выкарыстоўваюцца са старажытным суфіксам *-іц(а)*, які мае фемінізаванае значэнне: *крыт'ышаніца – крыт'ышынка –* ***Крыт'ышын****, рухч'аніца – рухч'анка –* ***Рухч'а.***

Для ўтварэння катайконімаў жаночага роду найбольш рэгулярна выкарыстоўваюцца суфіксы *-к(а), -анк(а), -чанк(а), -лянк(а), -чых(а).* Самым прадуктыўным з іх з'яўляецца суфікс *-к(а).* Ён уступае ў карэляцыйныя пары з суфіксамі:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:44:49

а) *-ец/-ац*, суаднесеныя з айконімамі на *-ка* (*в'ошчанка – вошчан'эц* – ***В'ошчанка,*** *глін'янка – глінян'эц* – ***Глін'янка***), *-ін/-ын (брод'ятынка – брод'ятынэц* – ***Брадз'яцін****, ст'олінка – ст'олінэц* – ***Ст'олін)****, -оў/-аў (кобр'овка – кобров'эц* – ***Кабр'оў****, хотісл'овка – хотісл'овэць* – ***Хаціслаў****), -ль, -нь (ольг'омэлька – ольг'омэлец* – ***Альг'омель,*** *ольп'энка – ольп'энэц* – ***Альп'ень****), -ова/-ава (андр'оновка – андр'оновэц* – ***Андр'онава****, бор'ысовка – бор'ысовэц* – ***Бар'ысава****), -ічы/-ычы (л'яхівка – ляхов'эц* – ***Л'яхавічы****, м'аньковка – маньков'эц* – ***М'анькавічы****), -аны/-яны (ольш'анка – ольш'анэц* – ***Альш'аны****, утр'анка – утр'анэц* – ***Утр'аны****);*

б) *-авец/-явец, -овец/-евец*, суаднесеныя з айконімамі на *-ка* (*в'ульковка – вульков'эц* – ***В'улька****), -іца/-ыца (б'ыстровка – быстров'эц* – ***Б'ыстрыца****), -ін/-ын (отч'ыновка – отчынов'эць* – ***В'отчын****), -ск/-цк (іл'овка – ілов'эц* – ***Іласк****), -ьjэ (завус'оковка – завус'оковэц* – ***Завус'очча****);*

в) *-анец/-янец, -енец, -інец*, суаднесеныя з айконімамі самых розных структурных тыпаў (*гольч'анка – гольч'анец* – ***Вугал'ец****, мотол'янка – мотол'янэц* – ***М'оталь****, відомл'янка – відомл'янэц* – ***Від'омля****, белов'ушанка – белов'ушанец* – ***Белав'уша****, дубыч'анка – дубыч'анэц* – ***Д'убіца****).*

Да найбольш прадуктыўных карэляцыйных пар адносяцца *-к(а) – -анін/-янін (гороч'анка – гороч'анін* – ***Гарадз'ец,*** *дворч'анка – дворч'анін* – ***Двар'эц)****; -анк(а) – -ец/-ац (мочул'янка – моч'улец* – ***Мач'ульь****); -чанк(а) – -авец/-явец (братыновч'анка – братынов'эц* – ***Брат'ынава).***

Да малапрадуктыўных адносяцца карэляцыйныя пары *-к(а) – -чанін, -чанец (новосэльч'анка – новосэльч'анін* – ***Навас'ёлкі****); -к(а) – -ук/-юк, -чук (опач'учка – опач'ук* – ***Ап'ака,*** *сэльч'учка – сэльч'ук* – ***Сял'ец****); -чанк(а) – -ун (бус'янка – бус'ун* – ***Б'уса****); -чых(а) – -ец (борковч'ыха – борков'эц* – ***Б'оркі****).*

Фемінныя суфіксы *-к(а),-анк(а), -чанк(а), -чых(а)* далучаюцца да маскулінных усечаных асноў на *-ін/-ын, -оў/-аў* і на цвёрды зычны, пры гэтым усякаюцца фіналі *-ін/-ын, -ец/-эц (бост'янянка – бост'ынэц* – ***Баст'ынь,*** *буховч'анка – бухов'эц* – ***Б'ухавічы,*** *цын'янка – цын'янін* – ***Цна)****.*

Калі ж на марфемным шве адбываецца фанематычная несумяшчальнасць або адсутнасць моўнай практыкі, тады катайконімы ўтвараюцца шляхам ад'ектывацыі або апісальным (субстантыў з прыназоўнікам) спосабам: ***Камянюкі*** // *з Камянюк* (мн.), *камынюцкія, з Камынюк, камынюцкі* (м.), *з Камынюк, камынюцка* (ж.)*;* ***Агова*** // ***Оговo****, агоўскі / оговскі; агоўцы / оговцы* (адз.), *з Агова* (м.) / *з Огова* (м.), *з Агова* (ж.) / *оговска, з Огова* (ж.).[9] Калі спосаб ад'ектывацыі характэрны і для размоўнага стылю і для літаратурнай мовы, то апісальны спосаб утварэння характэрны ў асноўным для афіцыйнай літаратуры.

Адтапанімныя дэрываты (ад'ектонімы і катайконімы) нараджаюцца звычайна пад уплывам афіцыйна-дзелавога стылю праз грамадска-сацыяльныя інстытуты. Аднак нярэдка для адной тэрыторыі тыповымі аказваюцца адны мадэлі, для другой – іншыя. Гэта тлумачыцца тым, што катайконімы і ад'ектонімы ўзнікаюць

[9] З. М. Заіка, *Слоўнік тапонімаў і адтапанімных дэрыватаў…*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 25/11/2026 07:44:49

і функцыянуюць у сістэмах розных дыялектных зон, а таму знаходзяцца ў залежнасці ад моўных асаблівасцяў, характэрных для гэтых сістэм. У літаратурную мову рэгулярна трапляюць мадэлі з розных дыялектаў, што з'яўляецца адной з асноўных прычын адсутнасці строгіх нормаў. Таму існуе патрэба ў актывізацыі заканамернасцяў у адтапанімнай словаўтваральнай сістэме.

У цэлым функцыянаванне айконімаў і адтапанімных дэрыватаў у арэале заходнепалескіх гаворак падпарадкоўваецца працэсу словаўтварэння ў роднай мове. Дыялектная спецыфіка іх праяўляецца галоўным чынам на фанетычным, акцэнталагічным і марфалагічным узроўнях.

Summary

The author takes the view that a full description of toponymic derivatives in West-Polesian dialects requires that all toponymic derivational series and the variance phenomenon be taken into consideration.

Toponymic derivational series are groups of derivative lexemes that form specific formal-semantic relations. The basic unit of such a derivational series is the toponym which determines the semantics of individual elements in the series.

The analysis of the material shows that in the formation of toponymic derivatives the crucial role is played by the grammatical gender of a toponym and the character of its root word.

The article distinguishes toponymic derivational series which consist of five elements: toponym, tononymic adjective, the name of inhabitant in the plural, the name of inhabitant in the masculine gender, and the name of inhabitant in the feminine gender.